ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
2
КРАСАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 13 (1313)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

"Беларускі універсітэт"
тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### КІНАЛЕКТОРЫЙ

«Дружба ў вяках і на вякі», прысвечаны 1300-годдзю ўтварэння Балгарскай дзяржавы арганізаваны таварыствам савецка-балгарскай дружбы БДУ імя У. І. Леніна. З лекцыяй «Савецка-балгарскія адносіны —прыклад сацыялістычнага інтэрнацыяналізму ў дзеянні» выступіў дацэнт Л. І. Давыдзенка.

Л. МАРЦЫЁНКА.

### НОВАЙ ФОРМАЙ

работы універсітэцкай бібліятэкі сталі тэматычныя выстаўкі-агляды навуковай літаратуры. Звыш 500 выданняў экспанавалася на аглядзе «Вучэнне, якое пераўтварае свет», што праводзіўся сумесна з кафедрамі гісторыі філасофіі і логікі і марксісцка-ленінскай філасофіі. 40 працэнтаў прадстаўленых кніг было выдадзена чытачам у час работы выстаўкі.

Л. ПЯСТКОЎСКАЯ,
старшы бібліятэкар.

### УРАЧЫСТЫ ВЫПУСК

навучэнцаў завочнай школы юных праграмістаў, сустрэча выпускнікоў сярэдніх школ горада з прадстаўнікамі дэканата і кафедр, экскурсія па факультэту і вылічальнаму цэнтру ўваходзілі ў праграму дзён адкрытых дзвярэй, якія прайшлі на факультэце прыкладной матэматыкі. З агітацыйнай праграмай выступіла перад гасцямі агітбрыгада факультэта.

М. ГРАМКО,
асістэнт кафедры агульнага праграміравання.

### АМАТАРЫ МУЗЫКІ

геаграфічнага факультэта маюць магчымасць рэгулярна слухаць кваліфікаваныя гутаркі аб сучасных кірунках у сусветным музычным жыцці, з якімі выступае чацвёртакурснік кансерваторыі Л. Гур'янаў.

В. МАСЛЮК,
студэнт геафака.

### 50-ГОДДЗЮ СТВАРЭННЯ

саюза камуністычнай моладзі Хо Шы Міна прысвячаўся ўрачысты вечар, які арганізавалі студэнты механіка-матэматычнага факультэта сумесна з камсамольцамі камвольнага камбіната і в'етнамскім зямляцтвам. На вечары прысутнічалі студэнты іншых замежных краін.

А. ЗАГРАЮК,
намеснік сакратара камітэта камсамола мехмата па інтэррабоце.

### ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

з пісьменнікам Барысам Сачанкам адбылася на факультэце журналістыкі. Вядомы беларускі празаік падзяліўся сваімі ўражаннямі і назіраннямі аб ЗША, адкуль ён толькі што вярнуўся.

П. ЦУНІК.

## Мабілізаваць творчыя намаганні

СТУДЭНТЫ, выкладчыкі і супрацоўнікі гістарычнага факультэта ўсім сэрцам успрынялі гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС. Зараз у аўдыторыях, кабінетах, на кафедрах ідзе карпатлівая работа па вывучэнню і практычнаму выкарыстанню дакументаў з'езда.

Зыходзячы з установак з'езда, які вызначыў важнейшымі кірункамі работы ў галіне грамадскіх навук распрацоўку праблем сацыяльнай структуры, развіцця палітычнай сістэмы сталага сацыялізму, калектыў кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму на прадстаячае пяцігоддзе паставіў задачу даследавання развіцця рабочага класа як вядучай сілы сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва. У дысертацыях, падручніках, манаграфіях, навуковых артыкулах, над якімі працуюць члены кафедры, аналізуюцца вядучая роля рабочага класа ў дзяржаўным жыцці, яго працоўная і грамадска-палітычная актыўнасць, змены ў сацыяльнай структуры ў розныя перыяды будаўніцтва сацыялізму і камунізму. Ужо ў гэтым годзе з некаторымі палажэннямі сваіх даследаванняў яны выступяць на навуковых канферэнцыях, будзе выпушчаны міжвузаўскі зборнік, у якім 6 артыкулаў напісаны супрацоўнікамі кафедры.

Не менш важны кірунак работы выкладчыкаў нашай кафедры — арганізацыя глыбокага вывучэння матэрыялаў XXVI з'езда КПСС у студэнцкіх калектывах. Пасля першага азнаямлення ў ходзе работы партыйнага форуму з яго асноўнымі рашэннямі пачаты новы, разлічаны на працяглую перспектыву, этап вывучэння дакументаў з'езда ў лекцыйных курсах, на практычных і семінарскіх занятках. Кандыдаты гістарычных навук А. П. Салькоў і В. А. Андруховіч распрацоўваюць метадычны дапаможнік, які дазволіць студэнтам больш удумліва і канкрэтна спасцігаць выпрацаваны партыяй курс. Па шматлікіх праблемах сацыяльна-палітычнага і эканамічнага жыцця краіны, што абмяркоўваліся на з'ездзе, студэнты пішуць работы, лепшыя з якіх будуць прадстаўлены на студэнцкую навуковую канферэнцыю. Больш глыбокаму засваенню ідэй з'езда паслужаць творчыя гутаркі ў акадэмічных групах, сустрэчы з дэлегатамі XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ, перадавікамі вытворчасці, ветэранамі працы, экскурсіі на прадпрыемствы Мінска.

У сувязі з шырокім абмеркаваннем матэрыялаў з'езда ўзрастае роля лекцыйна-прапагандысцкай работы членаў кафедры. Рэгулярна выступаюць у працоўных калектывах з лекцыямі аб XXVI з'ездзе КПСС дацэнты К. І. Осіпаў, І. А. Літвіноўскі, У. М. Сідараў, Л. А. Міхайлоўскі, Е. Ф. Саўчук. Іх выступленні будуюцца на канкрэтных і пераканаўчых прыкладах.

Мабілізацыя творчых намаганняў забяспечыць калектыву кафедры паспяховую дзейнасць у напрамках, якія вызначыў з'езд нашай партыі.

М. ЧАСНОЎСКІ,
выкладчык кафедры гісторыі СССР эпохі сацыялізму.

## АДМЕТНАСЦЬ ЧАСУ



### АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА

ПРАЗ ПРЫАДЧЫНЕНЫЯ ДЗВЕРЫ аўдыторыі даносіцца голас выкладчыка. З першых пачутых слоў пазнаеш радкі са «Слова аб палку Ігаравым». Мякка, меладычна і крыху таямніча гучаць яны. Гучаць на старaславянскай мове, на якой былі народжаны. І адчуваеш, што незацікаўленых у прафесара А. А. Лойкі проста не бывае. Тут не дазволіш сабе займацца нічым іншым. Адна з аўдыторый, выбраная наўгад... Іх на філфаку —дзесяткі. І ў кожнай —новае ў веданні роднай мовы і літаратуры, гісторыі свайго краю.

Сенняшні філфак — гэта не толькі шматлікія светлыя аўдыторыі, гэта 984 студэнты, 135 выкладчыкаў, якія працуюць на 7 кафедрах, 12 навуковых гуртkоў, фальклорны ансамбль... Нельга адразу пералічыць усё, што ўбірае ў сябе адзін са старэйшых факультэтаў універсітэта. А які ж філфак без літаратурных дыскусій і вечароў, сустрэч з пісьменнікамі і паэтамі...

(Працяг на 2-й стар.).

РЭПАРТАЖ З РАЗМЕРКАВАННЯ

## КРОК ДА САМАСТОЙНАСЦІ

РАНІЦА 26 САКАВІКА. Галоўны корпус універсітэта. Зала пасяджэнняў. Задоўга да пачатку размеркавання прыйшлі сюды пяцікурснікі факультэта журналістыкі. Гэты дзень для іх надзвычай хвалюючы. Надыходзіць мінута, калі кожны з 69 сённяшніх выпускнікоў журфака будзе ведаць дакладнае месца сваёй будучай працы. Самастойнай працы. А цяпер, чакаючы камісію па размеркаванню, студэнты дзеляцца планамі, надзеямі. Станаўлюся сведкай размовы Аляксандра Усені і Андрэя Мазаніка:

— Хацелася б,— гаворыць Андрэй,— паехаць у сваю пухавіцкую газету. Лічу яе сваёй таму, што шмат пісаў туды яшчэ да паступлення на журфак, не раз праходзіў там вытворчую практыку.

— Я таксама рашыў вярнуцца ў рэдакцыю, якая рэкамендавала мяне на вучобу. Маю на ўвазе старадарожскую «Поступ Кастрычніка». Мне ўжо і запрашэнне адтуль прыйшло,— працягвае Аляксандр.

...Неяк адразу сціхлі ўсе размовы. Заўважаю на тварах пяцікурснікаў павышанае ўзбуджэнне. Уваходзяць члены камісіі ў саставе прарэктара універсітэта прафесара У. Р. Івашына, загадчыка сектара агітацыі і прапаганды ЦК КПБ Г. М. Конанава, загадчыка сектара друку Мінскага абкома партыі А. У. Кітаева, намесніка дэкана журфака дацэнта І. І. Сачанкі, намесніка старшыні Дзяржкамітэта БССР па тэлебачанню і радыёвяшчанню В. Д. Чаніна.

Першай да стала камісіі падыходзіць Таццяна Чыгрынава.

— Таня на факультэце займалася толькі на выдатна, — характарызуе яе Іван Іванавіч Сачанка,— была заўсёды прыкладам для іншых. Друкавалася ў многіх рэспубліканскіх газетах, арымлівала пяцёркі за вытворчую практыку. Таня — адна з прэтэндэнтак на «чырвоны дыплом». На яе імя прыйшло запрашэнне са «Знамени юности».

Камісія згаджаецца з думкай намесніка дэкана, і шчаслівая Таня, распісаўшыся ў ведамасці, спяшаецца падзяліцца сваёй радасцю з аднакурснікамі.

Перад камісіяй — Віктар Дудко. Прынята аднагалоснае рашэнне накіраваць яго на працу ў «Звязду», з якой студэнт супрацоўнічаў на працягу вучобы на журфаку.

Наталля Якімава, Наталля Расоха, Павел Уладзіміраў, Фёдар Раманчук і іншыя будуць працаваць у газетах і на радыё ў розных гарадах і райцэнтрах рэспублікі.

З добрымі пажаданнямі звяртаюцца да выпускнікоў члены камісіі. Размеркаванне закончана, але студэнты будуць яшчэ доўга абмяркоўваць месцы назначэння і ўспамінаць гэты звычайны і незвычайны сакавіцкі дзень.

В. КРЫНІЧНЫ,
наш спец. кар.

РАШЭННІ З'ЕЗДА — У ПРАКТЫЧНЫЯ СПРАВЫ

# МАГІСТРАЛЬНЫ НАПРАМАК

**Нядаўна адбылася агульнауніверсітэцкая нарада па пытанню падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі — кандыдатаў і дактароў навук — у святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС. На нарадзе выступіў са змястоўным дакладам дэлегат партыйнага з'езда рэктар універсітэта акадэмік АН БССР У. А. БЕЛЫ. Прапануем яго выступленне ў скарачэнні.**

МНЕ выпаў вялікі гонар быць дэлегатам XXVI з'езда КПСС, і я магу сказаць, што з'езд — гэта і вынік работы, і планы на будучае. Што зроблена, якія рэзервы пакуль не выкарыстаны, у чым прычына тых ці іншых недахопаў — мы прывыклі да таго, што аб усім гаворыцца прама, адкрыта, з вялікай шчырасцю і прынцыповасцю. Цяжка перадаць словамі тую творчую атмасферу, якая панавала ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў. Незабыўнае ўражанне пакінуў Справаздачны даклад ЦК КПСС, з якім выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Леанід Ільіч Брэжнеў. У спакойным дзелавым тоне была дадзена ацэнка міжнароднага становішча, раскрыты шляхі павышэння дабрабыту народа, акрэслена развіццё галін народнай гаспадаркі, прааналізавана дзейнасць усіх сфер савецкага грамадства.

У дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, іншых выступленнях на з'ездзе яскрава відаць неаслабная ўвага і клопат партыі аб развіцці навукі і адукацыі. Не будзе перабольшаннем, калі скажу, што заклапочанасцю аб далейшым развіцці навукі і адукацыі пранізаны ўсе матэрыялы з'езда. І адной з галоўных задач, якія паставіла партыя на сваім форуме, з'яўляецца задача падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Ні ў адной з галін дзейнасці чалавека так не залежыць канчатковы вынік ад інтэлектуальнасці патэнцыялу кадраў, як у навуцы і адукацыі. Можна пабудаваць сотні НДІ, аснасціць іх першакласным абсталяваннем, але без галоўнай фігуры — вучонага — гэта ўсё будзе мёртвым грузам.

60-гадовая гісторыя БДУ імя У. І. Леніна дэманструе яскравы прыклад падрыхтоўкі выдатных спецыялістаў. З вышыні сённяшняга дня можна смела сказаць, што ў развіццё навукі, культуры і народнай гаспадаркі выпускнікі Белдзяржуніверсітэта ўнеслі значны ўклад. Са сцен універсітэта выйшлі вядомыя вучоныя і пісьменнікі, аўтарытэтныя партыйныя і дзяржаўныя дзеячы, педагогі, журналісты, спецыялісты народнай гаспадаркі.

Аднак нягледзячы на ўсе поспехі на сучасным этапе партыя і народ прад'яўляюць спецыялістам вышэйшай кваліфікацыі — дактарам і кандыдатам навук — новыя, яшчэ больш узрослыя патрабаванні. Як падкрэсліваў на з'ездзе Леанід Ільіч Брэжнеў, «навука павінна быць пастаянным «парушальнікам спакою», паказваючы, на якіх участках намеціліся застой і адставанне, дзе сучасны ўзровень ведаў дае магчымасць рухацца наперад хутчэй, больш паспяхова». Гэтыя словы — праграма нашых практычных спраў на бліжэйшыя гады.

У выніку калектыўных намаганняў у мінулым годзе ва універсітэце было абаронена больш 70 дысертацый. Гэта добры паказчык. Але нам прадстаіць зрабіць яшчэ больш. Перад калектывам універсітэта, як перад флагманам вышэйшай школы рэспублікі, стаіць задача далейшага ўдасканалення дзейнасці аспірантуры — галоўнага звяна ў падрыхтоўцы кандыдатаў навук. Усе мы ў свой час прайшлі праз аспірантуру, памятаем розныя перыяды, розныя конкурсы, узроўні падрыхтоўкі. Сёння ідэалізаваную мадэль аспіранта можна вылічыць схематычна, адбіраючы лепшых з лепшых школьнікаў-медалістаў, студэнтаў-выдатнікаў, якія праявілі схільнасць да навуковай работы і рэкамендаваныя ў аспірантуру. Сярод гэтых лепшых з лепшых павінна фарміравацца канкурыруючая група, а з яе адбіраецца самы вартыя.

Аспірант — гэта таленавіты малады чалавек з высокай працаздольнасцю і мэтанакіраванасцю, які беззапаветна любіць навуку, прысвячае ёй усё сваё жыццё. Гэта наш выпускнік, калі можна так сказаць, са знакам якасці.

Аднак калі мы паглядзім на сённяшні стан нашай аспірантуры, яе фарміравання, праходжання і выпуску, то карціна будзе не такой вясёлкавай. Аспірант зусім не той, якога мы хацелі б бачыць. Няма конкурсу пры прыёме. Кіраўнікі адбіраюць суб'ектыўна першага. Вынікі ўступных экзаменаў не адпавядаюць адзнакам у дыпломе.

Аналіз трох апошніх гадоў работы пераканаўча паказаў нашы недахопы ў камплектаванні аспірантуры. Спынімся на прычынах такога стану.

Перш за ўсё мы, старэйшае пакаленне, недастаткова прывіваем моладзі любоў да навукі. Дрэнна і тое, што вызначаем толькі на III—IV курсах рэальных прэтэндэнтаў у аспірантуру, не ствараем «маякоў» у студэнцкай навуцы, мала папулярызуем творчых студэнтаў. Кафедры і кіраўнікі прапаноўваюць часам не зусім аб'ектыўна каго-небудзь аднаго ў аспірантуру і не фарміруюць конкурс.

Не здымаючы віны з рэктарата, парткома, мясцкома, камітэта камсамола за стан спраў у аспірантуры, выкажу некалькі меркаванняў наконт факультэтаў. Факультэты — асноўнае падраздзяленне, якое каардынуе падрыхтоўку спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, — пакуль слаба спраўляецца з гэтым абавязкам: саветы рэдка і павярхоўна абмяркоўваюць пытанні падрыхтоўкі аспірантаў і спаборнікаў на атрыманне вучонай ступені, няма галоснага кантролю за дзейнасцю кіраўнікоў і праходжаннем аспірантуры. Неабходна два разы ў год заслухоўваць загадчыкаў кафедр аб рабоце лепшых студэнтаў, схільных да навукова-педагагічнай працы, загадзя адбіраць будучых кандыдатаў у аспірантуру і ствараць ім неабходныя ўмовы для творчасці.

Кафедрам і лабараторыям таксама пажадана павысіць увагу да студэнаў — патэнцыяльных аспірантаў, пачынаючы з III—IV курсаў. Кафедра павінна забяспечыць кожнага аспіранта педагагічнай нагрузкай, прыцягнуць яго да гасдагаворнай тэматыкі, даць арганізатарскія навыкі, стварыць усе неабходныя ўмовы для паспяховай работы.

Патрэбна падкрэсліць, што кафедры і іх загадчыкі нясуць персанальную адказнасць за падбор кандыдатур у аспірантуру. Кроўная справа калектываў кафедр — стварэнне творчай абстаноўкі для аспірантаў, бо трагедыя многіх нашых выпускнікоў у тым, што яны не ўмеюць дыскусіраваць, адстойваць свае навуковыя погляды. Відаць, варта часцей арганізоўваць творчыя дыскусіі, на якіх нашы аспіранты спрабавалі б свае сілы.

Важную ролю ў падрыхтоўцы аспіранта да абароны іграе навуковы кіраўнік. Ён, перш за ўсё, адказны за адбор кандыдатаў у аспірантуру. Ён жа, кіраўнік, павінен забяспечыць творчае развіццё ідэй самога аспіранта, дапамагаючы скласці план і кантраляваць яго выкананне.

Прад'яўляючы сур'ёзныя патрабаванні да факультэтаў, кафедр, кіраўнікоў за якасць падрыхтоўкі аспірантаў, мы часта забываемся пра іх саміх. На вялікі жаль, сустракаюцца аспіранты, прама скажам, якія выпадкова трапілі ў аспірантуру. Яны, відаць, лічаць, што аспірантура — гэта «заслужаны» адпачынак пасля 5-гадовага навучання. За апошні час мы выключылі 28 аспірантаў за невыкананне плана. Пераканаены, што гэта далёка не ўсе, хто заслугоўвае такой «узнагароды».

Удзяляючы максімум увагі навуковай рабоце аспірантаў, нельга вызваляць іх ад удзелу ў грамадскім жыцці факультэта. Гэта дапаможа развіццю арганізатарскіх навыкаў. Самае дэфіцытнае сёння — гэта арганізатары навукі. Глыбокія веды ў адпаведнай галіне, энцыклапедычнасць, уменне падначальваць дзейнасць калектыву галоўнай ідэі і ствараць творчы мікраклімат — вось якасці, неабходныя сённяшняму спецыялісту вышэйшай кваліфікацыі. Акрамя таго, ужо ў аспірантуры ён павінен умець дзяліцца багажом сваіх ведаў, адстойваць погляды марксісцка-ленінскай філасофіі і на яе аснове ацэньваць навакольныя з'явы.

Аспірантура ва універсітэце выгадна адрозніваецца ад іншых ВНУ магчымасцю пастаянных зносін гуманітарыяў і прыродазнаўцаў. Гэта важны фактар у гарманічным развіцці інтэлігента, але мы не ўдзяляем яму значнай увагі. Такое становішча неабходна тэрмінова выправіць. Нам уяўляецца — трэба стварыць клуб аспірантаў, праўленне якога сумесна з парткомам і камітэтам камсамола распрацуе шырокі план работы, у якім будзе адлюстраваны ўвесь спектр інтарэсаў творчай моладзі. Гэта і наведванне тэатраў, кіно, іншых устаноў культуры, сустрэчы з цікавымі людзьмі. Пасяджэнні клуба — творчыя дыскусіі, дзе сутыкаюцца погляды філосафа, хіміка, журналіста, фізіка, біёлага, медыка. Паявіцца база для больш плённых культурных сувязей з АН БССР, МРТІ, БПІ. Ёсць усе магчымасці для таго, каб адвесці адзін дзень у тыдзень для адпачынку аспірантаў ва універсітэцкім кафэ. Там яны змогуць не толькі цудоўна адпачыць, але і духоўна ўзбагаціцца, удзельнічаючы ў пасяджэннях секцый фотаслайдаў, літаратурнай, харэаграфічнай, іншых.

Трэба адзначыць недахоп галоснасці аб падрыхтоўцы аспірантаў. На кожнай кафедры, на факультэтах, у НДІ павінны быць вывешаны каляндарныя планы абарон, назвы дысертацый, прозвішчы кіраўнікоў. Абарона — падзея не толькі ў жыцці самога аспіранта, але і ўсяго калектыву універсітэта. Аб гэтым трэба памятаць. Вось чаму газеце «Беларускі універсітэт», насценным газетам падраздзяленняў патрэбна часцей інфармаваць грамадскасць аб абаронах дысертацый.

Як бачым, задачы, якія стаяць перад калектывам Белдзяржуніверсітэта ў падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі, — шматгранныя, складаныя. Па папярэдніх падліках толькі ў бягучым годзе павінна быць абаронена звыш 100 дысертацый. Думаецца, што гэтая лічба нам па плячы.

Ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXVI з'езда КПСС, кожны член нашага ардэнаноснага калектыву павінен знайсці такое прымяненне сваім сілам, сваёй творчай энергіі, каб сказаць у юбілейны для нас год, што ён шчыра і максімальна выканаў свой абавязак перад Радзімай.

# АДМЕТНАСЦЬ ЧАСУ

АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА





**(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).**

Адметнасць факультэта — традыцыйны злёт у Вязынцы, на радзіме народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. У адну з вясновых раніц шумлівым гоманам напаўняецца ваколіца Вязынкі. Мноства студэнтаў у беларускіх нацыянальных касцюмах, гучаць песні, вершы. Камітэт камсамола ўжо разгарнуў падрыхтоўку да свята. Рыхтуецца новая праграма, сувеніры, запрашаюцца госці...

З 1976 года існуе на факультэце свая бібліятэка. Будучым выкладчыкам, даследчыкам мовы і літаратуры, як нікому іншаму, патрэбна кніга. Яна — іх хлеб, іх праца. Агульны фонд бібліятэкі філалагічнага факультэта налічвае 55 тысяч экземпляраў вучэбнай, навуковай і мастацкай літаратуры. Знаёмімся з галоўным бібліятэкарам Святланай Георгіеўнай Елькінай. «Штогод мы атрымліваем каля 6 тысяч новых выданняў,— расказвае яна.— Акрамя гэтага, 92 перыядычныя выданні:

**(Заканчэнне на 3-й стар.).**

СТУДЭНТ І НАВУКА

## Запрашае «Філосаф»

**ПРАБЛЕМЫ гісторыі культуры і станаўлення асобы, феномена біяполя і крызісу сучаснай буржуазнай ідэалогіі выносяцца на парадак дня пасяджэнняў студэнцкага навуковага гуртка «Філосаф», які працуе на аддзяленні філасофіі нашага універсітэта. Тэматычная разнастайнасць абумоўлена, напэўна, як універсальнасцю філасофскага мыслення, так і складанасцю, насычанасцю, шматаблічнасцю каштоўнасцей, якія характарызуюць свет людзей, што стаяць на прыступцы XXI стагоддзя.**

**Асаблівая роля ў дынаміцы нашага часу належыць навуцы. Разгледжанню гэтай з'явы былі прысвечаны чарговыя заняткі па тэме «Фізічная карціна свету ў кантэксце сучаснай культуры». Перад студэнтамі выступілі намеснік загадчыка лабараторыі тэарэтычнай фізікі АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук Л. М. Тамільчык, прафесар кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна У. С. Сцёпін, навуковы кіраўнік гуртка. выкладчык І. Я. Шыршоў. Абмеркаванне пытанняў, якія задавалі студэнты, вызначалася яскравасцю ілюстрацый, энцыклапедычнасцю, эмацыянальнасцю. Наш навуковы гурток на справе робіць працэс пазнання радасным, ён стаў сапраўдным дыскусійным клубам, месцам зносін аднадумцаў.**

**На гэты семестр запланавана правядзенне яшчэ двух пасяджэнняў гуртка: «Праблемы псіхалогіі культуратворчасці» і «Філасофія контркультурнага руху». Стаў прыемнай традыцыяй той факт, што ў занятках гуртка прымаюць удзел не толькі студэнты-філосафы, але і гісторыкі, палітэканомы, прадстаўнікі Мінскага медыцынскага і тэатральна-мастацкага інстытутаў.**

**Л. СВЯРДЛОЎ, студэнт аддзялення філасофіі.**

МЫ — ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТЫ

# РАЗАМ—ДРУЖНАЯ СЯМ'Я

У ЦЯПЕРАШНІ час у БДУ навучаецца больш 800 замежных студэнтаў, прадстаўнікоў 66 краін Еўропы, Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.

З кожным годам мацуюцца нашы сувязі з зямляцтвамі В'етнама, ГДР, ПНР, Кубы, ЧССР, Грэцыі, Афганістана. Добрай практыкай стала заключэнне двухбаковых і трохбаковых дагавораў паміж камітэтам камсамола БДУ, замежнымі зямляцтвамі студэнтаў, якія займаюцца ў нашым універсітэце, і вытворчымі калектывамі г. Мінска. Трохбаковы дагавор звязвае, напрыклад, камсамольскія арганізацыі камвольнага камбіната, механіка-матэматычнага факультэта і в'етнамскага зямляцтва. Існуе такі дагавор паміж камсамольцамі філфака, Мінскага завода халадзільнікаў і зямляцтвам студэнтаў ГДР.

Зусім нядаўна, на ўрачыстым вечары, прысвечаным 33-й гадавіне перамогі народнай дэмакратыі ў Чэхаславакіі, на базе фізічнага факультэта быў падпісаны дагавор аб супрацоўніцтве з чэхаславацкім зямляцтвам студэнтаў.

Добрай традыцыяй у нас стала правядзенне тыдняў дружбы. З карысцю прайшлі тыдні савецка-нямецкай, савецка-лаоскай, савецка-в'етнамскай, савецка-чэхаславацкай дружбы. У час іх арганізоўваюцца сустрэчы замежных студэнтаў з перадавікамі вытворчасці, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, кіраўніцтвам універсітэта. Праводзяцца віктарыны па сацыялістычных краінах, дыспуты, «агеньчыкі». Нашы замежныя сябры разам з савецкімі студэнтамі праводзяць розныя спартыўныя мерапрыемствы. Усё гэта дапамагае замежным студэнтам лепш пазнаёміцца з савецкай рэчаіснасцю. Мацней становіцца наша дружба.

Камітэт камсамола Белдзяржуніверсітэта выкарыстоўвае розныя формы інтэрнацыянальнай работы. У апошні час стала традыцыйным правядзенне сумесна з адміністрацыяй кінатэатра «Кастрычнік» кінавечароў, прысвечаных знамянальным датам міжнароднага маладзёжнага руху, мітынгаў салідарнасці. Напярэдадні адкрыцця XXVI з'езда КПСС быў арганізаваны мітынг салідарнасці студэнтаў БДУ, прысвечаны салідарнасці моладзі і студэнтаў у барацьбе супраць каланіялізму. Рэзалюцыя, прынятая на мітынгу, была накіравана ў КМА БССР.

Цікава праходзяць сустрэчы ў камсамольска-маладзёжным кафэ універсітэта «Гаудэамус», на якіх студэнты знаёмяцца з нацыянальнай культурай асобных краін, праводзяць віктарыны, якія суправаджаюцца слайд-фільмамі.

Значны час замежныя студэнты, зразумела, праводзяць у інтэрнатах. Зрабіць так, каб інтэрнат стаў родным домам для іх, зрабіць цікавымі, змястоўнымі ўсе палітыка-выхаваўчыя мерапрыемствы, якія праводзяцца,—гэта таксама клопат камітэта камсамола. Пры інтэрнатах № 1, № 2, № 7 заканчваецца мастацкае афармленне пакояў дружбы, у якіх замежныя студэнты змогуць праводзіць розныя мерапрыемствы. Маляўніча афармленыя стэнды, вітрыны дазваляюць пазнаёміцца з брацкімі краінамі. Над стварэннем пакояў дружбы добра папрацавалі студэнты гістфака, філфака, а таксама студэнты з ГДР, ПНР, Кубы.

У дакладзе на XXVI з'ездзе партыі Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў сказаў: «У канстытуцыях большасці брацкіх краін падкрэсліваюцца ідэі дружбы і супрацоўніцтва з Савецкім Саюзам. Гэта — вялікі давер нашай краіне, і мы адкажам тым жа...»

У гэтых словах камітэт камсамола універсітэта бачыць канкрэтную праграму дзеяння па інтэрнацыянальнаму выхаванню.

**Л. ГАЙДУКЕВІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па інтэрнацыянальнаму выхаванню.**

# АДМЕТНАСЦЬ ЧАСУ

**АДЗІН ДЗЕНЬ ФАКУЛЬТЭТА**



**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).**

часопісы, газеты, літаратурныя альманахі. Ёсць і свае складанасці. Для кніг не хапае месца, прыходзіцца прыкладаць шмат намаганняў, каб усё размясціць».

З дня стварэння бібліятэкі працуе Святлана Георгіеўна. 2.779 чытачоў. І кожнаму студэнту ці выкладчыку дасць добрую параду, дапаможа ў выбары неабходных кніг.

У кабінеце методыкі і практыкі заняткі вядзе Таісія Аркадзьеўна Тарасевіч са студэнтамі з ГДР. Факультэт — буйнейшы цэнтр у краіне па падрыхтоўцы русістаў для замежных краін. Толькі за апошнія дзесяць гадоў на філфаку прайшлі навучанне каля 400 студэнтаў з ГДР, ПНР, Югаславіі, Балгарыі і іншых краін. Адзін з лепшых кабінетаў— лінгафонны. Ён поўнасцю аснашчаны сучасным абсталяваннем. Зараз тут займаецца спецгрупа англійскай мовы III курса. Ларыса Якімовіч заўсёды старанна рыхтуецца да заняткаў па замежнай мове.

На факультэце шмат арыгінальнага. Ад шырокай лесвіцы, вітражных вакон да аўдыторыі Янкі Купалы, Якуба Коласа. Тут пачуеш жывую беларускую гаворку. Любоў да народнай песні з'яднала ў фальклорным ансамблі В. Вячорку, Г. Аніскові́ч, І. Крук, В. Надтачэеву, Ю. Зыгмантовіч і іншых студэнтаў. Іх выступленні заўсёды жаданыя на канцэртах мастацкай самадзейнасці. Зараз яны рыхтуюцца да універсітэцкага агляду. Актавая зала не пустуе. Рэпетыцыі хору, студэнцкага тэатра мініяцюр, вакальна-інструментальнага ансамбля. Апошні створаны год таму назад. Але свой рэпертуар ужо склаўся. На мінулагоднім аглядзе творчы калектыў філолагаў заняў другое месца і сёлета ўступаць яго не збіраецца. Як і ва ўсіх сваіх справах.

**М. ЛАХВІЧ,**
**В. ШАЧАК** (фота).



**СПАТКАННЕ З ЦУДОЎНЫМ**

# НЕПАЎТОРНЫ ПАРТРЭТ МАСТАКА

125-ГОДДЗЮ мастака Міхаіла Аляксандравіча Врубеля быў прысвечаны літаратурна-музычны вечар, які прайшоў на геаграфічным факультэце.

Аб жыцці мастака і яго творах цікава і змястоўна расказала мастацтвазнаўца, старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага мастацкага музея БССР Ірына Васільеўна Назімава. Свой расказ яна суправаджала паказам на слайдах рэпрадукцый лепшых карцін М. А. Врубеля.

Мы ўбачылі вядомага «Дэмана», «Натуршчыцу ў абстаноўцы рэнесанса», партрэт С. І. Мамантава, «Царэўну-лебедзь», партрэт іспанскай танцоўшчыцы Атэра, які лічыцца лепшай работай Врубеля, што знаходзіцца ў беларускім мастацкім музеі.

На вечары прагучала музыка сучаснікаў мастака — Рубінштэйна, Рымскага-Корсакава, Мусаргскага. Мы адчулі непарыўную сувязь карцін Врубеля, цудоўнай музыкі вялікіх кампазітараў, неўміручых вершаў Пушкіна, Лермантава, Гётэ і выдатнага выканаўчага майстэрства Шаляпіна, Няжданавай. Усё гэта стварыла непаўторны эмацыянальны партрэт вялікага мастака.

Ларыса Вярцёлка прачытала вершы В. Брусава і А. Блока, прысвечаныя М. А. Врубелю. Данінай глыбокай павагі да творчасці мастака прагучаў Скрабінаўскі «Гімн мастацтву».

Гэту сустрэчу цудоўна падрыхтавалі і правялі сумесна з супрацоўнікамі аддзела масавай работы універсітэцкай бібліятэкі студэнты III курса геафака Ганна Давыдзенка, Ігар Будай, Ларыса Вярцёлка і іншыя.

**С. САКАЛОЎСКАЯ,**
**студэнтка II курса геафака.**

# ЛЕТАПІС БДУ

**(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8, 10, 11, 12).**

**1946 год**
**29 красавіка**

Пастанова Савета Міністраў СССР аб павелічэнні тэрміну навучання на завочных аддзяленнях універсітэтаў ад 5 да 6 гадоў.

**1947 год**
**7 лістапада**

Аднавіўся выхад шматтыражнай універсітэцкай газеты.

Першая экспедыцыя студэнтаў і супрацоўнікаў геаграфічнага факультэта для вывучэння Палесся.

Пры універсітэце заснаваны навукова-даследчы інстытут хіміі.

**1948 год**
**Снежань**

Сесія вучонага савета БДУ і навуковая студэнцкая канферэнцыя, прысвечаныя 30-годдзю БССР.

**1949 год**
**1 студзеня**

Пастановай Савета Міністраў СССР і ЦК ВКП(б) Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту прысвоена імя У. І. Леніна. Адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны гэтай важнай падзеі.

**Кастрычнік**

Стварэнне агульнауніверсітэцкага драматычнага калектыву шляхам аб'яднання гурткоў факультэтаў.

**1951 год**
**Люты**

У БДУ навучаецца звыш 1700 студэнтаў. У бягучым годзе будзе выпушчана больш 300 спецыялістаў.

**30 кастрычніка**

Споўнілася 30 гадоў з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Грамадскасць шырока адзначыла гэтую дату. Міністр вышэйшай адукацыі СССР выдаў загад, прысвечаны юбілею БДУ.

**1953 год**
**Люты**

Пачала праводзіцца штогадовая агульнауніверсітэцкая спартакіяда з запрашэннем каманд іншых ВНУ.

**1954 год**
**12 сакавіка**

Група камсамольцаў колькасцю 170 чалавек паехала ў Казахстан на асваенне цалінных земляў.

Адкрыта выдавецтва універсітэта.

**31 жніўня**

Уступіў у строй інтэрнат на 400 месц на вуліцы Бабруйскай.

**Верасень**

Па ініцыятыве ЦК ЛКСМБ упершыню праведзены Дзень мінскага студэнта, які стаў традыцыйным.

**(Працяг будзе).**






# АГУ!

## СПРАВЫ СЯМЕЙНЫЯ

ЗАЗВЯКАЛІ КЛЮЧЫ, заскрыгаталі замкі, бразнула клямка, дзверы прыадчыніліся. Другакурснік Аркадзь Дутаў імкліва шмыгнуў у праём, які ўтварыўся, і сутыкнуўся з маналітнай фігурай паважанай цешчы.

— Прывёз?— адразу і ўпарта запытала Анфіса Уласаўна Паніковіч, выціраючы мыльныя рукі аб фартух.

— Дзень добры!— разгубіўся Аркадзь і схаваў вочы. Ён быў сарамлівы і вельмі нерашучы.

— Лімоны, масла, каўбаса,— засмучана прамямліў Дутаў і паставіў на пафарбаваную бежавым колерам дашчаную падлогу два чамаданы, рукзак і клунак.

— Мыць рукі і пераапранацца!— строга напомніла Анфіса Уласаўна і, не паварочваючы галавы, распарадзілася:

—Федзя, выдай гэтаму!

Фёдар Адамавіч Паніковіч, першы і адзіны муж гаспадыні, мітусліва зашоргаў лямцавымі абноскамі і прынёс зяцю белы накрухмалены халат, белы рэспіратар і белыя тапачкі.

Дутаў памыўся і пераапрануўся.

На кухні яго чакала капуста, свіныя робрышкі, бліны і жонка Тамара.

— Прагаладаўся, зяблік!— забуркавала Тома, ласкава патрапаўшы шчаку мужа.

Аркадзь даядаў шаснаццаты блін. На дваццатым ён заснуў. Непрыкметна для сябе.

Ён сніў поле з адуванчыкамі, травой і рознакаляровымі стракозамі. У празрыстым небе адзінокі жаваранак задуменна насвіствае нейкую замежную мелодыю. Дутаў лёгка бяжыць па полю, закінуўшы да сонца галаву, а побач з ім яснавокі ружавашчокі хлапчук — яго сын Эдзік. Эдзік штосьці шчасліва лапоча Дутаву, махае рукамі, але Аркадзь не чуе яго, таму што дзесьці побач, заглушаючы ўсё, грукоча грозны вадапад.

Дутаў прачнуўся. З ваннай даносіліся булькаючыя гукі вадзяных струменяў, якія прызыўна барабанілі па намокшых пузырыстых баках пялёнак, распашонак, каптурыкаў.

— За мыццё!— зноў напомніла Анфіса Уласаўна і невясёлым позіркам праводзіла зяця на рабочае месца.

Праз дзве гадзіны ўсё было вымыта і развешана, а сам Дутаў, лёгка пахістваючыся ад стомы ў розныя бакі, ужо ўцюжыў падсушаныя падгузкі. Уцюжыў і асуджана думаў аб заўтрашнім дні. З раніцы на рынак за морквай, капустай, яблыкамі. Потым на малочную кухню, дзе яго сустрэне друзлая жанчына з запаленымі ад спрэчак і лаянак вачыма. А потым дываны, палавікі, дарожкі. І гэтак з раніцы і да апошняй электрычкі. А хутка сесія. І здаецца, радасці студэнта-бацькі можна пералічыць, не загінаючы пальцаў.

Дутаў цяжка ўздыхнуў і выключыў прас. У яго распараджэнні заставалася некалькі вольных хвілін. Амаль не дыхаючы, ён тайком пракраўся ў дзіцячы пакой, які нагадваў адначасова метэастанцыю, бальніцу і яслі. Са сцен ртутнымі ледзяшамі звешваліся тэрмометры, паблісквалі хромам флюгеры для вызначэння скразнякоў. На стале спачывала вясёлая група гумавых сосак, пустышак, грэлак...

Дутаў прабраўся да драўлянай калыскі сына Эдзіка і замілавана паглядзеў на яго.

— Агу! — шырока адкрыўшы вочы, расчулена вымавіў Эдзік. У Дутава адлягло. Тут яго разумелі.





## Парадыйны клуб «Пакуты Пегаса»

**Па шматлікіх просьбах чытачоў — аматараў паэзіі і ўсяго іншага вершаванага і застрафаванага — ЛІФТ адкрывае парадыйны клуб «Пакуты Пегаса».**

**З уступным словам выступае рыфм-жакей клуба Леапольд ПУГІН:**

### ЛЕТАратары

Зноў навадніла ўвесь белы свет
лава слязлівых лірыкаў.
Зноў прапануюць старонкі
газет
казённых і іншых лірнікаў.

Зноў заштампованы пах раллі
дорыць нам вершаў ворах,
бедныя шэрыя жураўлі
плачуць у шэрых творах.

Крочаць далёка ў марах сваіх
(Вена, Парыж і Сена).
Зноў на пегасікаў кволых іх
траціцца прорва сена.

Водпуск — у Сочы (творчы ж
народ!..)
Паэты чакаюць лета...
Так і праходзіць за годам год.
Лета чакае паэтаў.

*ПРЫЙШЛА ВЯСНА. Амур раскідаў усюды свае вострыя стрэлы кахання. Людзі сталі часцей усміхацца і гавараць адзін аднаму кампліменты. Прыемныя, і проста смешныя. І калі аднойчы хто-небудзь дзеля жарту весела вас разыграе, ведайце — гэта прыйшоў сусветны Дзень смеху. І не шкадуйце часу, зазірніце да нас, на Лірычна-Іранічны ФакультэТ (ЛІФТ), бо ў дзень гэты — наша свята. Свята гумару, свята добрага настрою, а значыць, свята жыцця. І прыйшло яно да нас на гадзіну раней, чым звычайна.*



**Першае красавіка да нашай эры.**

## ПАСЛЯ РАЗМЕРКАВАННЯ

# ФІЛОЛАГІ

— ГЭТА ВЕЛЬМІ ПРОСТА,— сказала Алачка.—Бярэш два яйкі, разбіваеш іх — жаўткі асобна, бялкі асобна. Стакан цукру, сто грамаў масла. Усё пераплюхваеш як след і пурхаеш у невялікае карытца. Стакан мукі туды — і раструхваеш сечкай. Не давай таяць! Растае — усё прапала! Плюхаеш лыжку воцату і смела зашпэндзівай у халадзільнік. А пасля адфутбольвай адразу ў духоўку, і няхай пазяхаюць пры 160. Адначасова плюхаеш згушчонку ў кіпяток, і можаш пакуль пудрыць мардаварот. Сочні канчаткова пазяхаюцца, ты замусліваеш іх ператворанай згушчонкай — і ў цяпло, каб добра прыжмуркнуліся. Госці падграбаюць, а ў цябе не пірог — ідылія са старажытнага жыцця! Зразумела? Усё проста, як у кіно.

— Сапраўды проста,— пагадзілася. Хацелася запытаць яшчэ, як робяць каўрыжку, але тут празвінеў званок, і мы разышліся па класах. Алачка яшчэ мусоліла Тургенева, а я са сваімі ахламонамі ўжо сядзела на Маякоўскім.



# ХРОНІКА

### СЕНСАЦЫЙНАЯ ЗНАХОДКА

**Пры рэстаўрацыі 419-й аўдыторыі знойдзена серыя выгравіраваных на стале надпісаў. Па аднадушнаму рашэнню вучонага савета матэрыял заслугоўвае доктарскай дысертацыі.**

**Пошукі аўтара з мэтай прысуджэння яму навуковай ступені працягваюцца. Матэматык, адгукніся!**

### НОВАЕ Ў СВЕЦЕ НАВУКІ

#### НЕЗРАЗУМЕЛЫ ФЕНОМЕН: ЛЯТАЮЧЫЯ ВІДЭЛЬЦЫ

**Са сталовай інтэрната № 5 таямнічым чынам зніклі відэльцы. Для раскрыцця загадкі прыроды створана аўтарытэтная камісія ў саставе пяці акадэмікаў, загадчыцы сталовай і аднаго каменданта.**

# ЭЎРЫКА!

## АМБУЛАТОРЫЙ ЛІФТа

«КУРЫЦЬ АЛЬБО НЕ КУРЫЦЬ?—вось у чым пытанне», —амаль па-гамлетаўскі падумаў трэцякурснік Марцапанаў і разгублена памацаў лоб. Перад яго вачыма, нібы скарасны экспрэс, ліхаманкава пранеслася ўсё жыццё, атручанае нікацінавым дымам.

— Эўрыка!— праз хвіліну ўзрушана грымнуў Марцапанаў.— Не курыць!

Ён падышоў да люстэрка і ўважліва паглядзеў на свой худы, пажаўцелы ад празмернага курэння твар.

«Які я брыдкі»,—з жахам падумаў Марцапанаў і заплюшчыў вочы. Яму стала сорамна. За сябе і за ўсё чалавецтва, якое хварэе гэтай дрэннай і небяспечнай звычкай.

— Хопіць! Надакучыла! Сёння ж, зараз жа кіну, — сціснуўшы зубы, цвёрда вырашыў Марцапанаў і ўявіў сябе зусім іншым чалавекам. Маладым, таленавітым, прыгожым і дужым, якога не душыць па раніцах праціўны кашаль і не бярэ ад хуткай хадзьбы адышка. Чалавекам, якога зусім не хвалюе апусцелы пачак у кішэні і ўвесь час знікаючыя невядома куды запалкі. Чалавекам, якому не пагражаюць усялякія бязлітасныя хваробы накшталт рака лёгкіх і іншых.



Марцапанаў уявіў, з якой зайздрасцю паглядзяць на яго ўсе факультэцкія курыльшчыкі, а выкладчыкі на чале з дэканам адразу прасякнуцца да яго павагай і любоўю. Нават прыгажуня Ніначка з суседняй групы ўрэшце зверне на яго ўвагу, і ён стане самым шчаслівым чалавекам на ўсёй зямлі. Гэтыя думкі праносіліся ў галаве Марцапанава. Ён міжволі ўсміхнуўся і адчуў прыемнае, ні з чым не параўнальнае хваляванне. Кожную хвіліну яно расло і мацнела. А калі ператварылася ў неабсяжную магутную хвалю, Марцапанаў не вытрымаў. Дрыготкімі пальцамі ён дастаў цыгарэту. Дастаў і закурыў, зацягваючыся ўсё глыбей і глыбей.




### ДА ЎВАГІ АМАТАРАЎ ГУМАРУ

**Лірычна-Іранічны ФакультэТ аб'яўляе конкурс на лепшую гумарэску, малюнак, верш, байку, пародыю і г. д. Лепшыя з дасланых работ будуць адразу змешчаны на чарговых старонках ЛІФТа пад рубрыкай «Наш конкурс», а аўтарыпераможцы будуць узнагароджаны каштоўнымі сувенірамі, грашовымі прэміямі.**

**ЛІФТ з вялікай нецярплівасцю чакае вашых допісаў, паважаныя чытачы!**

**У святочным нумары ЛІФТа аб справах сямейных паведаміў У. Лісоўскі («Агу!»); прапанаваў новы рэцэпт смачнага пірага П. Лагі («Філолагі»); хроніку сабраў творчы калектыў гумарыстычнай насценгазеты «Рошым любую задачу»; рабілі экскурс у мінулае і пелі калыханку мастакі Н. Дораш і Я. Булава. Першым выкрыкнуў «Эўрыка!» дзяжурны ліфцёр С. Лыскавец.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

2 красавіка 1981 г.

Заказ 576. АТ 02161

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ